# Заліковая кантрольная работа

## Кантрольная работа

***Увага: кожнае заданне спачатку трэба поўнасцю перапісаць у сшытак і толькі потым выканаць!!***

Заданне 1. Выберыце правільны варыянт (варыянты).

На мухе – на мусе – на мусі; на шчацэ – на шчаке – на шчацы; у страху – у страсе – у страхе; на пні – на пне – на пню; у снягу – у снеге – у снезе; на двaрэ – на двары – на двару; россып'ю – рассыпам – россыпам; у гаі – у гаю – у гае; на рагу – на розе – на роге; вугла – вуглу – вугалу; вугаля – вугалю – вугалля; на сцягу – на сцязе – на сцяге; пад'езда – пад'езду – падаезду.

Заданне 2. Утварыце словазлучэнні з прыналежнымі прыметнікамі.

(Валодзя) кнігі, (дачка) паліто, (старшыня) загад, (мядзведзь) бярлог, (сабака) хвост, (сініца) гняздо, (сяброўка) кніга, (сябар) часопіс, (котка) корм, (Ясь) камп'ютар, (сваяк) прыезд, (Аленка) лялька, (сястра) чаравік, (тата) клопат, (ліса) след, (Ганулька) торба, (Колас) творы, (дзядзька) падарунак, (жонка) звычка, (Сцёпка) ліст, (Жэня) рэчы [запішыце два словазлучэння: *калі Жэня – дзяўчынка і калі Жэня – хлопец*].

Заданне 3. Устаўце патрэбную форму зваротнага займенніка *сябе.*

1. Нішто __________!
2. Языча, языча, сам ______________ дабра не зыча.
3. Вяроўку на _______________ шукаць.
4. Што ____________ не міла, таго і другому не зыч.
5. З вялікага гурту выбірай ____________ курту.
6. Кожныя граблі да _____________ горнуць.
7. Сам не ў _____________.
8. Не гудзі, а на ________________ пaглядзі.
9. Сам ___________ загубіш, як чужую жонку палюбіш.
10. Есці як не ў _____________ .

Заданне 4. Запішыце сказ, раскрыйце дужкі і замяніце лічбы словамі.

Наш кіёск папоўніўся 845 (новы падручнік), 215 (вялікі сшытак для малявання), 186 (мяккі аловак), 555 (беларуска-рускі слоўнік), 397 (кніга для дамашняга чытання), 2478 (дапаможнікамі для абітурыентаў).

Заданне 5. Выберыце правільны варыянт / варыянты.

Туфель – туфля, Васін мяч – Васёў мяч, цёткава хустка – цётчына хустка – цёткіна хустка, Сашыны кнігі – Сашавы кнігі, Іван меншы з брата – Іван менш за брата, замінаць цябе – замінаць табе, ушчуваць цябе – ушчуваць табе, папікаць сябе – папікаць сабе, з пяцьсот рублямі – з пяццюстамі рублямі – з пяцістамі рублямі, са ста трыццаццю шасцю – са сто трыццаццю шасцю – са ста трыццаць шасцю, адрачацца – адракацца, мяркуемыя вынікі – меркаваныя вынікі, пасівеўшы ад гора – пасівелы з гора.

Заданне 6. Перакладзіце на беларускую мову.

Болеть гриппом, в области биологии, уверенно приближаться к цели, ответственно отнестись к заданию, отрежьте сами себе хлеба, идти за грибами, тоска по родине, ходить по домам, над широкой степью, аллея с тополями, который час, яблоки вкуснее груш, не с кем поговорить, заячья нора, беличьи припасы, сметься над ним, остановились около ручья, похож на отца, достижения в области строительства, не может простить себя, жениться на Ольге, искренне благодарить спасателей, по роману Короткевича, писать по адресу, рассмотреть по пунктам, благодарю вас, похож на предыдущий опыт, три новых прибора, четыре пятых, коснуться этого вопроса, издеваться над чужим мнением, отречься от своих убеждений, зайти за письмом, подготовиться к работе, начало в семь часов вечера, подойти к преподавателю.

Заданне 7. Перакладзіце на беларускую мову.

Девиз университета –«Всегда в движении»

Белорусский государственный университет физической культуры единственное профильное учебное заведение Республики Беларусь, осуществляющее подготовку кадров в области физической культуры, спорта и туризма.

Университет обеспечивает современный уровень образования специалистов, ориентированных на профессиональное развитие, гражданские ценности, социальную ответственность в соответствии с требованиями, запросами и ожиданиями, личности, общества, государства.

БГУФК стремится повысить международный престиж страны, способствовать развитию образования в области физической культуры, спорта и туризма, повышению качества жизни и здоровья нации.

Заданне 8. Спачатку перапішыце. Потым перакладзіце на рускую мову. Пераклад таксама запішыце.

Асноўныя прафесійныя кампетэнцыі, якімі павінен валодаць выпускнік факультэта фізічнай культуры:

✧ набываць новыя веды, выкарыстоўваючы сучасныя тэхналогіі;

✧ арганізоўваць і якасна праводзіць заняткі па фізічным выхаванні навучэнцаў, спартыўнай трэніроўцы, аздараўленчай фізічнай культуры і турызму;

✧ умець правільна нарміраваць нагрузкі на фізкультурна-аздараўленчых і спартыўных занятках з улікам стану здароўя, узросту, полу і падрыхтаванасці навучэнцаў;

✧ планаваць і ажыццяўляць працэс фарміравання тэхнікі рухальных дзеянняў і выхавання фізічных якасцей;

✧ кантраляваць нагрузкі і фізічны стан тых, хто займаецца фізічнай культурай і спортам;

✧ вызначаць эфектыўнасць вучэбна-трэніровачнага працэсу па фізічнай культуры і спорту;

✧ арганізоўваць і весці навучанне настаўніцкага, інструктарскага і трэнерскага персаналу, ажыццяўляць мерапрыемствы па прадухіленні вытворчага траўматызму;

✧ умець вызначаць і ацэньваць функцыянальны стан арганізма;

✧ ведаць формы і метады арганізацыі фізічнага выхавання, фізкультурна-аздараўленчай работы і спартыўнай трэніроўкі;

✧ складаць комплексы фізічных практыкаванняў і сродкаў здаровага ладу жыцця (загартоўвання, рацыянальнага харчавання, псіхаэмацыйнай рэгуляцыі, рацыяналізацыі рэжыму працы і адпачынку);

✧ валодаць тэхнікай судзейства спартыўных спаборніцтваў на ўзроўні масавага спорту; прымяняць метады і сродкі правядзення метадычнай працы ў галіне фізічнай культуры іспорту